**ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ**

## ЖАДАННЕ

Да цябе прыйсці хачу я
з вершам новым.
Але ён вандруе –
ходзіць па дубровах:
З ветрам перагукваецца,
З дзятлам перастукваецца.
Паспрабуй яго знайсці!

Ён – у жураўліным клічы,
ў хмарцы светлай
Ці ляціць касмічнаю ракетай?
Роснага,
заранкавага,
Вострага,
маланкавага –
я хачу яго знайсці!
Хай малой галінкай будзе ў гаі шчодрым,
Хай малой цаглінкай будзе ў краі родным,
Хваляю кіпучаю,
Кропляю гаючаю!
Я хачу яго знайсці!
Вечны ў сэрцы неспакой –
і ўдзень, і ўночы!
Я служу ў сябе самой
чорнарабочай.
Па лясному адрасу
І на сцягу радасным –
я хачу яго знайсці!

*1967*